БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 811.161.3(072)(043.3)

МАРТЫНКЕВІЧ

СВЯТЛАНА ВАСІЛЬЕЎНА

# МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ БАЗАВЫХ ВЕДАЎ І ЎМЕННЯЎ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (V – VI класы)

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка
навучання і выхавання (беларуская мова)

Мінск, 2014

Работа выканана ў навукова-метадычнай установе "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Яленскі Мікалай Георгіевіч**, доктар педагагічных навук, прафесар, намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь |
| Афіцыйныя апаненты: | **Іўчанкаў Віктар Іванавіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| | **Дзёміна Ніна Паўлаўна,** кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін дзяржаўнай установы адукацыі "Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі" |
| Апаніруючая арганізацыя | установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы" |

Абарона адбудзецца 10 красавіка 2014 г. у 14. 00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.21 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, аўд. 62; тэлефон вучонага сакратара 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы « 07» сакавіка 2014 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт Т.У. Ігнатовіч

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў набыла актуальнасць яшчэ ў канцы 60-х гадоў ХХ ст. і атрымала грунтоўную распрацоўку ў методыцы выкладання замежных моў (М. Канейл, М. Лонг, М. Свейн, Д. Хіл, Н. Хомскі і інш.). З сярэдзіны 80-х гадоў ХХ ст. праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў актыўна распрацоўваецца ў методыцы выкладання рускай мовы (А.В. Архіпава, А.А. Быстрова, І.А. Зімняя, А. Д. Дзейкіна, В.І. Капінос, Т.С. Кудраўцава, А.Ю. Купалава, Ф.М. Літвінка, Л.А. Мурына, Я.І. Пасаў, В.Ф. Русецкі, М.М. Шанскі і інш.). Аднак рэалізацыя задач камунікатыўнага навучання, вызначаных нарматыўнымі дакументамі, на сучасным этапе развіцця моўнай адукацыі ў беларускай лінгваметодыцы як асобная праблема спецыяльна не даследавалася. Асобныя аспекты камунікатыўна арыентаванага навучання беларускай мове разглядалі Г.М. Валочка, Л.С. Васюковіч, Л.А. Гамеза, В.А. Ляшчынская, Л.А. Мурына, І.М. Саматыя, У.П. Саўко, В.Я. Шкілёнак і інш.

Пра недастаткова грунтоўнае даследаванне праблемы сведчыць і адукацыйная практыка. Пры сістэматычным навучанні беларускай мове камунікатыўныя ўменні застаюцца на нізкім узроўні: вучні не валодаюць беларускай мовай як сродкам зносін. Сітуацыя незбалансаванага білінгвізму ў краіне не дазваляе вучням паўнавартасна накопліваць натуральны вопыт суразмоўніцтва на беларускай мове. Таму фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў павінна распрацоўвацца на аснове **базавых ведаў і ўменняў** з пачатку засваення курса беларускай мовы ў V – VI класах. Базавыя веды і ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі забяспечваюць міжасобасную камунікацыю, успрыманне і разуменне выказвання ў розных сітуацыях сацыяльнага жыцця.

**Актуальнасць** тэмы і праблемы даследавання абумоўлена: 1) значнасцю авалодання зместам вучэбнага прадмета “Беларуская мова” ў V – VI класах у камунікатыўным аспекце, таму што на названых этапах вывучаюцца асноўныя раздзелы сістэмнага курса беларускай мовы (фанетыка, лексіка, марфеміка, марфалогія, сінтаксіс, маўленне); 2) недастатковай тэарэтычнай распрацаванасцю базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ў методыцы выкладання беларускай мовы; 3) неабходнасцю распрацоўкі і ўкаранення ***методыкі фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў*** з мэтай практычнага авалодання беларускай мовай як сродкам зносін, бо набытыя веды і ўменні па беларускай мове на пачатковым этапе навучання, узроставыя асаблівасці

вучняў V – VI класаў садзейнічаюць іх мэтанакіраванаму моўнаму, маўленчаму і ўласна камунікатыўнаму развіццю.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне звязана з навукова-даследчай дзейнасцю:

1) лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі ў межах галіновай навукова-тэхнічнай праграмы “Адукацыя і здароўе”, заданне “Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне гуманітарнай адукацыі ў кантэксце фарміравання ў вучняў грамадзянскай, духоўна-маральнай, камунікатыўнай і мастацкай культуры як сродку рэалізацыі асобасна арыентаванага і культуралагічнага падыходаў” (2006 – 2008 гг.), дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20063636;

2) кафедры беларускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава ў межах выканання дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў “Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння”, заданне “Беларуская мова як этнакультурная з’ява ў сінхраніі і дыяхраніі” (2006 – 2010 гг.), дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20062096; “Агульнанацыянальныя і рэгіянальныя моўныя працэсы ў камунікатыўнай прасторы Рэспублікі Беларусь: гісторыя і сучаснасць”, заданне “Этнапрастора беларускіх рэгіёнаў у мове і культуры: мінулае і сучаснасць” (2011 – 2015 гг.), дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20111545.

**Мэта і задачы даследавання. Мэта** даследавання – вызначыць тэарэтычныя асновы і распрацаваць методыку фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў, праверыць яе эфектыўнасць у працэсе вывучэння асноўных раздзелаў сістэматычнага курса беларускай мовы.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных **задач:**

1) вызначыць асноўныя напрамкі, падыходы і прынцыпы фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі;

2) распрацаваць сістэму базавых ведаў і ўменняў для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі ў адпаведнасці з яе асноўнымі структурнымі кампанентамі;

3) вызначыць камунікатыўны патэнцыял сродкаў навучання беларускай мове ў V – VI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі; распрацаваць крытэрыі ацэнкі сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі і вызначыць зыходны ўзровень іх сфарміраванасці ў вучняў V – VI класаў;

4) распрацаваць методыку фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў і праверыць яе эфектыўнасць пры навучанні беларускай мове ў V – VI класах.

**Аб'ект даследавання:** працэс фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў пры навучанні беларускай мове ў V – VI класах ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

**Прадмет даследавання:** методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў у працэсе навучання беларускай мове ў V і VI класах.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены наступнымі фактарамі: *па-першае,* важна, каб у працэсе вывучэння беларускай мовы ў V – VI класах вучні засвоілі змест вучэбнага прадмета "Беларуская мова" ў камунікатыўным аспекце, бо менавіта на гэтых этапах выкладаюцца асноўныя раздзелы беларускай мовы – фанетыка і арфаэпія, графіка і арфаграфія, лексіка і фразеалогія, марфеміка і словаўтварэнне, марфалогія, падаюцца прапедэўтычныя звесткі з сінтаксісу. *Па-другое,* прынцып пераемнасці і перспектыўнасці навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі дае магчымасць развіваць лексіка-граматычныя і маўленчыя веды і ўменні і ў сваю чаргу стварае аснову для камунікатыўнага развіцця вучняў. Таму пры мэтанакіраванай арганізацыі навучання беларускай мове ў V – VI класах магчыма стварыць трывалыя асновы – базавыя веды і ўменні – для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў ажыццяўляецца на аснове двух метадычных напрамкаў: засваенне базавых ведаў камунікатыўнай кампетэнцыі і авалоданне базавымі ўменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі.

*Базавыя веды камунікатыўнай кампетэнцыі* – гэта моўныя, маўленчыя і ўласна камунікатыўныя факты і з'явы, на аснове якіх адбываецца засваенне моўных нормаў, маўленчых паняццяў і ўласна камунікатыўных правіл вербальных паводзін. *Базавыя ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі* – гэта здольнасць вучняў на аснове засвоеных ведаў выконваць тэарэтычныя і практычныя дзеянні – аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення і наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве.

Тэарэтычныя асновы фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі забяспечваюць *сістэмна-функцыянальны*, *камунікатыўна-дзейнасны і кампетэнтнасны падыходы*. Фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ажыццяўляецца ў

адпаведнасці з прынцыпамі *ўзаемасувязі фарміравання базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў*; *камунікатыўнай функцыянальнасці моўных адзінак і маўленчых паняццяў; стварэння камунікатыўна-маўленчых сітуацый*; *камунікатыўнай крэатыўнасці і актыўнасці навучання.* У адпаведнасці з імі забяспечваецца засваенне моўнай нормы праз разгляд функцый моўных адзінак; усведамленне таго, як адбіраюцца і працуюць адзінкі і законы мовы ў рэальнай маўленчай камунікацыі. У выніку адбываецца авалоданне беларускай мовай як сродкам паўнавартаснага суразмоўніцтва, што неабходна ва ўмовах білінгвізму.

2. Базавыя веды і ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі суадносяцца з яе асноўнымі кампанентамі – моўным, маўленчым і ўласна камунікатыўным. Сістэма *базавых моўных ведаў* і *ўменняў* (звесткі пра функцыянальныя адзінкі беларускай мовы і правілы іх ужывання) грунтуецца на разглядзе моўных адзінак з пазіцыі асаблівасцей іх функцыянавання і ўдзелу ў перадачы сэнсу выказвання, узаемадзеяння з элементамі розных узроўняў мовы. *Базавыя маўленчыя веды і ўменні* (маўленчыя паняцці, уменні маўленчай дзейнасці, усведамленне камунікатыўных якасцей маўлення) ствараюць аснову для разумення вучнямі сітуацыі маўлення, якая дыктуе выбар лексічных адзінак для выказвання згодна з камунікатыўнам намерам. *Уласна камунікатыўныя веды* і *ўменні* (засваенне правілаў маўленчых пводзін, прадуцыраванне ўласных выказванняў) выяўляюць камунікатыўны патэнцыял беларускай мовы і вызначаюць авалоданне ёй як сродкам зносін у розных сітуацыях суразмоўніцтва.

3. Аналіз зместу навучання паказаў, што падручнікі па беларускай мове для V і VI класаў скіроўваюць вучняў на засваенне мовы як сістэмы, аднак вучэбны матэрыял, накіраваны на фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі, носіць несістэмны характар, што не садзейнічае авалоданню мовай як сродкам зносін. Крытэрыі вызначэння ўзроўню сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў суадносныя з яе асноўнымі кампанентамі: *крытэрый якасці адбору моўных сродкаў* (моўны кампанент); *крытэрый маўленчай кампетэнцыі выказвання, крытэрыі колькасна-інфармацыйны, якасна-інфармацыйны і камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення* (маўленчы кампанент); *сацыякультурны і этыка-прагматычны крытэрыі* (уласна камунікатыўны кампанент). Зафіксаваны нездавальняючы ўзровень сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў тлумачыцца як адсутнасцю актыўнай маўленчай практыкі ў рэальным маўленчым асяроддзі (сямейна-побытавыя зносіны, суразмоўніцтва з аднагодкамі), так і недастатковым камунікатыўным

патэнцыялам падручнікаў, у якіх не ўлічаны ўзровень маўленчага развіцця вучняў, адсутнасцю ўласна камунікатыўных звестак у праграме і адпаведна ў вучэбных дапаможніках.

4. Методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў грунтуецца на падыходах, прынцыпах, распрацаваным змесце базавых ведаў і ўменняў і ўключае **сістэму спецыяльных практыкаванняў.** *Камунікатыўна-моўныя* практыкаванні фарміруюць базавыя моўныя ўменні і нормы ўжывання адзінак розных узроўняў мовы ў маўленні, што садзейнічае правільнасці афармлення выказвання ў пэўнай сітуацыі; *камунікатыўна-маўленчыя* практыкаванні садзейнічаюць як свядомаму, так і імпліцытнаму засваенню сутнасці маўленчых паняццяў, фарміраванню базавых уменняў маўленчай дзейнасці і ўсведамленню камунікатыўных якасцей маўлення; сістэма *ўласна камунікатыўных* практыкаванняў накіравана на свядомае авалоданне спосабамі выражэння камунікатыўнага намеру згодна з правіламі маўленчых паводзін у розных сітуацыях маўлення, формул маўленчага этыкету і сацыяльна маркіраваных маўленчых адзінак. На аснове базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў адбываецца мэтанакіраванае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў.

Прапанаваная методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі садзейнічае авалоданню беларускай мовай як сродкам зносін і аптымізацыі працэсу навучання беларускай мове.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыя з’яўляецца вынікам самастойнага даследавання аўтара, у якім:

1) вызначаны тэарэтычныя асновы – напрамкі *(засваенне базавых ведаў камунікатыўнай кампетэнцыі і авалоданне базавымі ўменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі)*, падыходы (*сістэмна-функцыянальны*, *камунікатыўна-дзейнасны і кампетэнтнасны)* і прынцыпы *(узаемасувязі фарміравання базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў*; *камунікатыўнай функцыянальнасці моўных адзінак і маўленчых паняццяў; стварэння камунікатыўна-маўленчых сітуацый*; *камунікатыўнай крэатыўнасці і актыўнасці навучання)* фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў;

2) распрацаваны змест фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі – сістэма базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў у адпаведнасці з асноўнымі структурнымі кампанентамі камунікатыўнай кампетэнцыі (моўным, маўленчым, уласна камунікатыўным);

3) вызначаны камунікатыўны патэнцыял сродкаў навучання беларускай мове ў V – VI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі; распрацаваны крытэрыі ацэнкі сфарміраванасці базавых моўных (*крытэрый якасці адбору моўных сродкаў*), маўленчых (*крытэрыі маўленчай кампетэнцыі выказвання, колькасна-інфармацыйны, якасна-інфармацыйны і камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення*) і ўласна камунікатыўных (*сацыякультурны і этыка-прагматычны крытэрыі*) ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі і выяўлены зыходны ўзровень іх сфарміраванасці ў вучняў V – VI класаў;

4) распрацавана методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў, якая грунтуецца на вызначаных напрамках, падыходах, прынцыпах, змесце і рэалізуецца *сістэмай камунікатыўна-моўных, камунікатыўна-маўленчых і ўласна камунікатыўных* практыкаванняў.

Методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў прайшла эксперыментальную праверку і знайшла адлюстраванне ў вучэбна-метадычным дапаможніку “Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5 – 6 класы)” з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2010) для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

Вывады і вынікі працы выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання беларускай мове ў V – VI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама ў сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў-філолагаў, курсе методыкі выкладання беларускай мовы ў ВНУ.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання апрабоўваліся на навукова-практычных канферэнцыях выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў ВДУ імя П.М. Машэрава (2005 – 2013 гг.); рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: “Актуальныя праблемы выкладання беларускай мовы на сучасным этапе” (Мінск, красавік 2005 г.), “Креативные подходы в организации образовательного процесса” (Гомель, снежань 2007 г.), “Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі” (Брэст, сакавік 2008 г., сакавік 2013 г.), “Сучасная моўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: праблемы, перспектывы” (Мінск, красавік 2010 г.), “Система менеджмента качества в современном университете: достижения, проблемы и перспективы” (Віцебск, чэрвень 2010 г.), “Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце” (Віцебск, кастрычнік 2010 г.), “Нацыянальна-культурны кампанент у дыялектнай і літаратурнай

мове” (Брэст, кастрычнік 2012 г.). Міжнародных канферэнцыях: III Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Пісьменнік – мова – стыль” (Мінск, верасень, 2005 г.), VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія” (Віцебск, красавік 2006 г.), V Міжнароднай канферэнцыі “Мова – Літаратура – Культура” (Мінск, лістапад 2006 г.), IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Текст. Язык. Человек” (Мазыр, май 2007 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Куляшоўскія чытанні” (Магілёў, красавік 2009 г.), V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Текст. Язык. Человек” (Мазыр, май 2009 г.), VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства” (Віцебск, кастрычнік 2009 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Актуальные проблемы современного гуманитарного познания” (Віцебск, кастрычнік 2009 г.), Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі “Формирование языковой компетенции в процессе профессиональной подготовки специалистов: традиции, новации, опыт внедрения современных технологий обучения” (Мінск, сакавік 2011 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Актуальные проблемы приграничных районов Беларуси и Российской Федерации” (Віцебск, май 201 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Педагогические инновации: традиции, опыт, перспективы” (Віцебск, 3 мая 2012 г.); IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства і культуралогія” (Віцебск, лістапад 2013 г.).

Асноўныя вынікі даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 41 публікацыі, з якіх 9 (5,2 аўт. арк.) адпавядаюць патрабаванням пункта 18 “Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь”. Іншыя навуковыя публікацыі па тэме пацвярджаюць практычную значнасць дысертацыйнага даследавання: 1 вучэбна-метадычны дапаможнік (6,04 аўт. арк.), 3 метадычныя дапаможнікі (7,55 аўт. арк.), 28 артыкулаў у зборніках навуковых прац і матэрыялаў канферэнцый (6,2 аўт. арк.).

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Структура дысертацыі абумоўлена мэтай, задачамі, характарам аб’екта, прадмета даследавання. Тэкст дысертацыі складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і 3 дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі складае 192 с., у тым ліку 3 табліцы на 13 с., 7 малюнкаў на 3 с., 3 дадаткі на 52 с.,

бібліяграфічны спіс (137 назваў выкарыстаных крыніц і 41 назва публікацый саіскальніка) на 15 с. У дадатках змешчаны 16 табліц на 14 с. і 3 малюнкі на 2 с.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе **"Тэарэтычныя асновы фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі"** абгрунтоўваюцца асноўныя напрамкі і тэарэтычныя падыходы методыкі фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі, разглядаюцца метадычныя прынцыпы, вызначаецца змест фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў.

У працах замежных лінгваметадыстаў адзначаецца, што камунікатыўная кампетэнцыя – гэта здольнасць забяспечваць моўнымі сродкамі маўленчыя паводзіны ў працэсе суразмоўніцтва, ствараць і ўспрымаць выказванне ў адпаведнасці з мэтай, сферай і сітуацыяй маўлення, наладжваць кантакт з суразмоўцамі і ўключацца ў маўленчую дзейнасць. Авалоданне вучнямі беларускай мовай як сродкам зносін будзе адбывацца па меры паступовага фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, пры гэтым базай з'яўляюцца моўныя сродкі, а вяршыняй – камунікатыўныя ўменні. Таму асноўнымі напрамкамі вучэбнай дзейнасці вызначаем засваенне базавых ведаў камунікатыўнай кампетэнцыі і авалоданне базавымі ўменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі. Разам з гэтым неабходна ўдакладніць змест яе базавых адзінак – ведаў і ўменняў.

***Базавыя веды камунікатыўнай кампетэнцыі*** – гэта моўны, маўленчы і ўласна камунікатыўны матэрыял, факты і з'явы, на аснове якіх адбываецца засваенне моўных нормаў, маўленчых паняццяў і ўласна камунікатыўных правіл вербальных паводзін. ***Базавыя ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі*** – гэта здольнасць вучняў на аснове засвоеных ведаў выконваць тэарэтычныя і практычныя дзеянні – аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення і наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве. Прымаючы пад увагу асаблівасці навучання беларускай мове на сучасным этапе развіцця моўнай сітуацыі і падзяляючы думку пра структуру камунікатыўнай кампетэнцыі як упарадкаванае аб'яднанне кампанентаў, лічым неабходным вызначыць комплекс *базавых ведаў і ўменняў, якія адпавядаюць кампанентам камунікатыўнай кампетэнцыі (моўнаму, маўленчаму, уласна камунікатыўнаму) і адсутнічаюць у вучэбнай праграме па беларускай мове II ступені навучання.*

Тэарэтычныя асновы працэсу фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вызначаюцца сістэмна-функцыянальным, камунікатыўна-дзейнасным і кампетэнтнасным падыходамі. *Сістэмна-функцыянальны падыход* накіроўвае да функцыянальнай прэзентацыі моўных адзінак і падводзіць да разумення таго, як яны ўзаемадзейнічаюць у маўленні. *Камунікатыўна-дзейнасны падыход* патрабуе стварэння для вучняў спецыяльных умоў для актыўнай асобасна значымай маўленчай дзейнасці. *Кампетэнтнасны падыход* вызначае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі на аснове ўзаемасувязі моўнага, маўленчага і ўласна камунікатыўнага зместу навучання. Уменні паўнавартаснай камунікацыі на беларускай мове набываюцца ў практычнай вучэбнай дзейнасці, дзе сродкі вучэбнай дзейнасці – веды і ўменні – становяцца сродкамі фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў.

Фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ажыццяўляецца на аснове наступных прынцыпаў: *прынцып узаемасувязі фарміравання базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў,* які патрабуе цэласнага ўспрымання сістэмы мовы як сродку адлюстравання рэчаіснасці, выражэння думак і авалодання формамі і правіламі суразмоўніцтва; *прынцып камунікатыўнай функцыянальнасці моўных адзінак і маўленчых паняццяў*, які вызначае разгляд моўных фактаў і з’яў не ізалявана, а ў сістэме парадыгматычных і сінтагматычных сувязей, характарызуючы іх змест, будову і функцыі ў залежнасці ад камунікатыўнай задачы, тыпу і стылю выказвання. *Прынцып стварэння камунікатыўна-маўленчых сітуацый* накіроўвае на апісанне розных аспектаў камунікатыўнага працэсу, дэманстрацыю варыянтаў афармлення думкі ў залежнасці ад сітуацыі маўлення. *Прынцып камунікатыўнай крэатыўнасці і актыўнасці навучання* вызначае творчую ацэнку і выбар актыўных формаў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з умовамі камунікацыі, апісанымі ў вучэбнай сітуацыі.

Фарміраванню моўнага кампанента камунікатыўнай кампетэнцыі садзейнічаюць *базавыя веды пра моўныя факты і з’явы*, якія апісваюць усе ўзроўні беларускай мовы ў функцыянальным аспекце, спрыяюць фарміраванню цэласнага ўяўлення пра мову як сістэму. Інавацыйная сутнасць зместу базавых моўных ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі заключаецца ў тым, што яны грунтуюцца на разглядзе моўных адзінак з пазіцыі асаблівасцей іх функцыянавання і ўдзелу ў перадачы сэнсу выказвання. Разам з асэнсаваннем іх камунікатыўна-функцыянальнай значымасці для працэсу суразмоўніцтва праз параўнанне, супастаўленне і выяўленне найбольш мэтазгодных варыянтаў адбываецца выбар патрэбных моўных адзінак для выражэння думкі.

На аснове *базавых маўленчых ведаў і ўменняў,* якія складаюць маўленчы кампанент камунікатыўнай кампетэнцыі, адбываецца афармленне выказвання з улікам маўленчай сітуацыі, дакладная ацэнка тэкстаў з пазіцыі камунікатыўных якасцей маўлення. Сістэма базавых маўленчых ведаў, распрацаваная на аснове маўленчых паняццяў (сітуацыя маўлення, тэкст, стылі, жанры, функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення, дыялог і маналог), карэлюе з уменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі. Інавацыйны змест фарміравання маўленчага кампанента камунікатыўнай кампетэнцыі заключаецца ў тым, што ў працэсе навучання адбываецца ўсведамленне вучнямі фактараў маўлення, якія дыктуюць выбар лексічных адзінак, вызначаюць дарэчнасць іх ужывання ў выказванні, забяспечваюць эфектыўнасць працэсу ўспрымання маўлення. Інавацыйны кірунак у засваенні базавых ведаў па тэорыі тэксту вызначае ўключэнне іх у маўленчую сітуацыю. Гэта спрыяе ўсведамленню таго, што тэкст – прадукт маўленчай дзейнасці чалавека, а адбор моўных сродкаў для яго стварэння залежыць ад умоў маўлення.

*Змест фарміравання ўласна камунікатыўнага кампанента камунікатыўнай кампетэнцыі з’яўляецца поўнасцю інавацыйным.* Асновай для яго распрацоўкі паслужылі палажэнні тэорыі маўленчай дзейнасці. Моўнае і маўленчае развіццё вучняў немагчымае без уліку ўласна камунікатыўнага аспекту, які прадвызначае авалоданне ветлівымі і карэктнымі формамі зносін. Таму базавыя ўласна камунікатыўная веды і ўменні распрацаваны з улікам правіл арганізацыі суразмоўніцтва ў адпаведнасці з сацыяльнымі нормамі маўленчых паводзін. Для дэманстрацыі патэнцыяльных магчымасцей беларускай мовы абслугоўваць неафіцыйную і афіцыйную сферы прапанаваны сітуацыі, якія найбольш запатрабаваныя ў рэальных міжасобасных зносінах вучнямі V – VI класаў: *знаёмства, просьба, прабачэнне, парада (рэкамендацыя), прапанова, адмова, віншаванне, усхваляльнае слова, тэлефонная размова, падтрымка кантакту ў вусным маўленні* і інш. Пры вывучэнні раздзелаў і асобных тэм курса беларускай мовы яны арганічна дапаўняюць граматычны матэрыял і падводзяць вучняў да ўсведамлення яго неабходнасці для практыкі суразмоўніцтва. У працэсе засваення ўласна камунікатыўных ведаў выяўляецца камунікатыўны патэнцыял беларускай мовы, уласна камунікатыўныя ўменні вызначаюць авалоданне ёй як сродкам зносін. Такім чынам, моўныя, маўленчыя і ўласна камунікатыўныя базавыя веды і ўменні арганічна спалучаюцца ў працэсе выкладання курса беларускай мовы і ствараюць аснову фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі.

У другой главе “**Узровень сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў устаноў адукацыі з**

**рускай мовай навучання”** пададзены лінгваметадычны аналіз праграм і падручнікаў па беларускай мове для V і VI класаў, распрацоўваюцца крытэрыі ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі, па выніках канстатуючага эксперымента вызначаецца ўзровень іх развіцця ў вучняў V – VI класаў.

Як сведчыць праведзенае даследаванне, базавыя моўныя і маўленчыя веды і ўменні, уключаныя ў вучэбную праграму па беларускай мове ў V – VI класах, не ўтвараюць **сістэмы** фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі. Базавыя ўласна камунікатыўныя веды і ўменні, звязаныя з арганізацыяй суразмоўніцтва, адсутнічаюць, нягледзячы на адну з задач моўнай адукацыі – павышэнне культуры маўленчых паводзін. Праведзены аналіз зместу навучання паказаў: падручнікі закладваюць асновы вывучэння мовы, што рэалізуецца ў тэарэтычнай частцы. Аднак метадычны апарат засваення зместу навучання ў большасці выпадкаў не арыентаваны на матываваную рэпрэзентацыю моўных уменняў вучняў, не ўлічвае іх рэальны ўзровень маўленчага развіцця. Да таго ж вучэбныя тэксты ў сваёй большасці не выяўляюць маўленчы аспект тэмы з далейшым выхадам на камунікацыю. Такім чынам, пры даследаванні выяўлена, што падручнікі па беларускай мове для V і VI класаў арыентуюць вучняў на засваенне сістэмы мовы, аднак вучэбны матэрыял не накіраваны на фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі і не садзейнічае авалоданню мовай як сродкам зносін.

Вызначэнне ўзроўню сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ажыццяўлялася на аснове распрацаваных крытэрыяў, суадносных з яе кампанентамі. Сфарміраванасць базавых моўных ведаў і ўменняў, ступень усведамлення камунікатыўнай значымасці моўных адзінак для маўлення выявіў крытэрый *якасці адбору моўных сродкаў*. Узровень сфарміраванасці базавых маўленчых ведаў выяўляўся з дапамогай крытэрыю *маўленчай кампетэнцыі выказвання.* Узровень базавых маўленчых уменняў – адпаведнасць выказвання тэме, завершанасць частак і правільнасць ужытага фактычнага матэрыялу – канстатаваны на аснове *колькасна-інфармацыйнага* крытэрыю. *Якасна-інфармацыйны* крытэрый вызначыў паслядоўнасць і лагічнасць зместу, правільнасць кампазіцыйнага афармлення выказвання. Ступень усведамлення вучнямі камунікатыўных якасцей маўлення была канстатавана з дапамогай крытэрыю *камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення*. Ступень сфарміраванасці базавых уласна камунікатыўных ведаў і ўменняў вызначалася на аснове *сацыякультурнага* (уменне будаваць выказванне ў адпаведнасці з экстралінгвістычнымі фактарамі маўлення) *і этыка-прагматычнага* (узровень валодання сродкамі маўленчага этыкету,

разнастайнымі прыёмамі і спосабамі выражэння думак у час суразмоўніцтва) крытэрыяў. Такім чынам, у працэсе канстатуючага эксперымента было выяўлена, што 73% вучняў не валодаюць у дастатковай ступені базавымі моўнымі ведамі і ўменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі. Вынікі аналізу выказванняў засведчылі недастатковы ўзровень сфарміраванасці базавых маўленчых ведаў і ўменняў у 69% вучняў. Аналіз вынікаў канстатуючага эксперымента паказаў, што 82,3% апытаных вучняў не маюць дастатковага ўзроўню развіцця базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі. Відавочна наступнае: калі вучні не могуць якасна пабудаваць выказванне ў неабмежаваных часам умовах, значыць, у рэальных зносінах яны адчуваюць яшчэ большыя цяжкасці як моўнага, маўленчага, так і ўласна камунікатыўнага характару. З гэтага вынікае неабходнасць узмацніць камунікатыўную накіраванасць вучэбнага прадмета “Беларуская мова” ў V і VI класах з арыентацыяй на фарміраванне базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі.

У трэцяй главе **“Эксперыментальная методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў устаноў адукацыі з рускай мовай навучання”** сфармуляваны задачы навучальнага эксперымента і апісана методыка фарміравання базавых моўных ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V і VI класаў.

Распрацаваная намі методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ўкаранялася ў практыку навучання беларускай мове ў тых адукацыйных установах, дзе праходзіў канстатуючы эксперымент: у дзяржаўных установах адукацыі “Сярэдняя школа № 29”, “Сярэдняя школа № 31”, “Сярэдняя школа № 15”, “Сярэдняя школа № 8” г. Віцебска; “Сярэдняя школа № 27” і “Сярэдняя школа № 179” г. Мінска, Сасноўскай базавай школе Віцебскага раёна. Фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі адбывалася пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса беларускай мовы ў V і VI класах. У навучальным эксперыменце ўдзельнічала 270 вучняў.

Фарміраванне базавых моўных ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі грунтавалася на сістэме ***камунікатыўна-моўных практыкаванняў***, накіраваных на: 1) *аналіз моўных адзінак* у тэксце, дзе яны ўтвараюць сваю маўленчую *сістэму*, якая падпарадкавана выражэнню пэўных камунікатыўных задач; 2) складанне *лексіка-граматычнага цэнтра,* які ілюструе вывучаемую моўную з’яву, і выяўленне функцыі моўных адзінак у маўленні; 3) уключэнне моўных адзінак – слоў, словазлучэнняў, сказаў – у *выказванне.*

Сістэма камунікатыўна-моўных практыкаванняў пры вывучэнні *сінтаксісу* накіравана на засваенне спосабаў спалучэння слоў у словазлучэнні і сказы, правіл арганізацыі выказвання ў адпаведнасці з сітуацыяй маўлення.

Сістэма камунікатыўна-моўных практыкаванняў пры навучанні *фанетыцы* зарыентавана на ўсведамленне таго, што правільнае маўленне заключаецца ў захаванні арфаэпічных і інтанацыйных нормаў, характарызуецца адпаведным тонам, тэмпам і гучнасцю. Выяўленне функцыянальнага аспекту фанетычнага матэрыялу праз сістэму камунікатыўна-моўных практыкаванняў падводзіла вучняў да разумення асаблівасцей фанетычнага ладу беларускай мовы і выпрацоўкі камунікатыўна значымых арфаэпічных нормаў маўлення.

Камунікатыўна-моўныя практыкаванні, накіраваныя на засваенне *лексікі* беларускай мовы, грунтаваліся на разглядзе слова з пазіцыі яго функцыянавання ў маўленні – сферы ўжывання, стылістычнай прыналежнасці, актыўнага ці пасіўнага выкарыстання. Дзякуючы сістэме спецыяльных заданняў вучні асэнсоўвалі, што ў час выказвання падставай для адбору канкрэтных лексічных і граматычных сродкаў служыць у першую чаргу іх семантыка.

Фарміраванне базавых моўных ведаў камунікатыўнай кампетэнцыі пры вывучэнні *марфалогіі* адбывалася праз асэнсаванне камунікатыўнай функцыі часцін мовы ў дасягненні інфарматыўнасці выказвання, фарміравання базавых уменняў дакладна ўжываць словаформы ў маўленні ў адпаведнасці з лексічным і граматычным значэннем, выяўляць іх спалучальныя і тэкстаўтваральныя магчымасці, што ў цэлым прывяло да зместавага, а не фармальнага асэнсавання структуры беларускай мовы.

Фарміраванне базавых маўленчых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі адбывалася на аснове сістэмы ***камунікатыўна-маўленчых практыкаванняў***, накіраваных на: 1) свядомае ці імпліцытнае засваенне *сутнасці маўленчых паняццяў*; 2) моўна-стылістычны *аналіз* тэксту як адзінкі маўлення і ўсведамленне камунікатыўных якасцей маўлення (дакладнасці, выразнасці, лагічнасці, чысціні, дарэчнасці, багацця); 3) стварэнне *выказвання* на аснове ўменняў ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці.

У працэсе засваення маўленчых паняццяў выяўлялася: 1) сітуацыйная абумоўленасць маўлення, таму ў сістэму працы ўключаліся заданні, распрацаваныя з улікам такіх складнікаў сітуацыі маўлення, як *адрасант, адрасат, месца, мэта выказвання*; 2) залежнасць выніку маўленча-мысліцельнай дзейнасці суразмоўцаў ад іх камунікатыўнага намеру і сацыяльна-ролевай характарыстыкі; 3) роля вызначаных фактараў для стварэння ўласных выказванняў. Акрэслены кірунак дапамагае матываваць

розныя віды вучэбнай працы, у выніку чаго вучні разумеюць практычную значнасць маўленчых ведаў і ўменняў, якія яны набываюць пры вывучэнні праграмнага матэрыялу.

Сістэма камунікатыўна-маўленчых практыкаванняў звязана з вывучэннем паняццяў *сітуацыя маўлення, тэкст, стылі, жанры, функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення, дыялог і маналог*. Значнае месца адводзілася стварэнню выказванняў розных жанраў. Іх прыметы засвойваліся імпліцытна праз практычную дзейнасць у працэсе аналізу тэкстаў: разглядаліся адметныя рысы маўленчай сітуацыі, змястоўныя, кампазіцыйныя і лінгвастылістычныя асаблівасці тэксту пэўнага жанру. Такім чынам, сістэма камунікатыўна-маўленчых практыкаванняў садзейнічала як свядомаму, так і імпліцытнаму засваенню сутнасці маўленчых паняццяў, фарміраванню ўменняў маўленчай дзейнасці і ўсведамленню камунікатыўных якасцей маўлення, што ў выніку забяспечвала фарміраванне маўленчага кампанента камунікатыўнай кампетэнцыі. Выкананне такіх практыкаванняў адбывалася ў комплексе з удасканаленнем базавых моўных ведаў і ўменняў і прадугледжвала стварэнне выказванняў.

Фарміраванне базавых уласна камунікатыўных ведаў і ўменняў адбывалася пры выкананні ***ўласна камунікатыўных практыкаванняў,*** якія былі накіраваны на: 1) засваенне спосабаў выражэння думкі ў адпаведнасці з мэтай, задачамі і ўмовамі зносін і правіл маўленчых паводзін праз *камунікатыўны аналіз тэксту* або праз імітацыю суразмоўніцтва ў працэсе *сацыяльна-ролевай гульні;* 2) засваенне формул маўленчага этыкету і сацыяльна маркіраваных маўленчых адзінак праз *камунікатыўны каментарый*; 3) дэманстрацыю засвоеных уласна камунікатыўных ведаў і ўменняў праз уключэнне іх у *выказванне*.

Сітуацыйная абумоўленасць выказванняў, якія ствараліся вучнямі пасля камунікатыўнага аналізу тэксту і ў час сацыяльна-ролевай гульні, раскрывалася праз *камунікатыўны каментарый*. Вучні даведваліся пра спосабы афармлення ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай такіх выказванняў, як прывітанне, развітанне, знаёмства, просьба, прабачэнне, парада (рэкамендацыя), прапанова, адмова, віншаванне, усхваляльнае слова, тэлефонная размова, падтрымка кантакту ў вусным маўленні.

Сістэма ўласна камунікатыўных практыкаванняў, распрацаваных на аснове *камунікатыўнага аналізу тэксту*, накіравана на засваенне нормаў маўленчых паводзін суразмоўцаў, формул маўленчага этыкету і інш.

Сістэма ўласна камунікатыўных практыкаванняў на аснове *сацыяльна-ролевай гульні* ўключала заданні на замацаванне розных спосабаў выражэння

камунікатыўнага намеру ў залежнасці ад умоў і сітуацый маўлення *(прывітанне, запрашэнне, адмова, перакананне, падтрымка, рэкамендацыя, парада, падзяка, прабачэнне, камплімент, згода/нязгода і інш.)*.

Такім чынам, на аснове ўласна камунікатыўных практыкаванняў вучні авалодвалі ўласна камунікатыўнымі ведамі і ўменнямі, неабходнымі для дакладнага выражэння камунікатыўнага намеру, паспяховага дасягнення мэты камунікацыі і эфектыўнасці маўленчых зносін у розных жыццёвых сітуацыях. Спалучэнне моўных і маўленчых ведаў з іх практычнай рэалізацыяй у распрацаваных гульнявых сітуацыях падкрэслівала іх неабходнасць і значымасць пры вывучэнні адпаведных тэм.

Аналіз вынікаў навучання ў эксперыментальных і кантрольных класах паказаў эфектыўнасць распрацаванай намі методыкі (малюнак).




**Малюнак – Узроўні сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў кантрольных і эксперыментальных класаў**

У адрозненне ад вучняў кантрольных класаў, вучні эксперыментальных класаў прадэманстравалі высокі ўзровень сфарміраванасці базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі. Улік сэнсава-функцыянальнага аспекту і матываванасці засваення моўных сродкаў, актывізацыя маўленча-мысліцельнай дзейнасці вучняў дазволілі падпарадкаваць працэс навучання беларускай мове камунікатыўнай мэце – авалоданню мовай як сродкам зносін, пры дапамозе якога можна спасцігаць навакольны свет.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў ажыццяўляецца на аснове двух метадычных *напрамкаў*: засваенне базавых ведаў камунікатыўнай кампетэнцыі і аваложанне базавымі ўменнямі камунікатыўнай кампетэнцыі.

*Базавыя веды камунікатыўнай кампетэнцыі* – гэта моўны, маўленчы і ўласна камунікатыўны матэрыял, факты і з’явы, на аснове якіх адбываецца засваенне моўных нормаў, маўленчых паняццяў і ўласна камунікатыўных правіл вербальных паводзін. *Базавыя ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі* – гэта здольнасць вучняў на аснове засвоеных ведаў выконваць тэарэтычныя і практычныя дзеянні – аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення і наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве. Распрацаваны змест фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі суадносіцца з яе асноўнымі кампанентамі – моўным, маўленчым і ўласна камунікатыўным. Тэарэтычныя асновы працэсу фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вызначаюцца сістэмна-функцыянальным, камунікатыўна-дзейнасным і кампетэнтнасным падыходамі. *Сістэмна-функцыянальны падыход* забяспечвае фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі і прадугледжвае разгляд функцыянальнага і камунікатыўнага аспектаў як моўнага, так і маўленчага матэрыялу. *Камунікатыўна-дзейнасны падыход* вызначае патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу, такія, як сітуацыйнасць навучання, стварэнне для вучняў спецыяльных умоў у межах канкрэтных жыццёвых сітуацый, што ў выніку стварае дзейнасную аснову для працы. *Кампетэнтнасны падыход* садзейнічае актуалізацыі як асабістага вопыту вучняў, набытага ў час вучэбнай дзейнасці, так і ведаў пра навакольную рэчаіснасць, што неабходна для забеспячэння працэсу суразмоўніцтва. Інтэграваны характар кампетэнтнаснага падыходу вызначае ўзаемасувязь моўнага, маўленчага і ўласна камунікатыўнага зместу фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі пры навучанні беларускай мове.

З вызначаных падыходаў вынікаюць прынцыпы фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі. *Прынцып узаемасувязі фарміравання базавых моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных ведаў і ўменняў* камунікатыўнай кампетэнцыі прадугледжвае спалучэнне моўнага, маўленчага і ўласна камунікатыўнага зместу пры вывучэнні нарматыўна і камунікатыўна значымых моўных фактаў і з’яў, на аснове чаго адбываецца засваенне нормаў беларускай мовы і аваложанне ёй як сродкам зносін. *Прынцып камунікатыўнай функцыянальнасці моўных адзінак і маўленчых паняццяў* патрабуе разглядаць моўныя факты і з’явы, характарызаваць іх не толькі з

пункту гледжання зместу, будовы, але і функцыі, акцэнтаваць увагу на прадмеце вучэбнай дзейнасці праз цікавыя тэксты, нетрадыцыйныя заданні і інш., сфарміраваць трывалыя пазнавальныя матывы, якія ў далейшым могуць стаць першаснымі пры авалоданні беларускай мовай. *Прынцып стварэння камунікатыўна-маўленчых сітуацый* дазваляе вучням уявіць сябе суразмоўцам у час маўлення, арганізуе навучанне з уключэннем характарыстык маўленчых сітуацый, дзе маўленне і паводзіны падпарадкоўваюцца прынятым правілам. *Прынцып камунікатыўнай крэатыўнасці і актыўнасці навучання* вызначае самастойны выбар шляхоў рэалізацыі маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з умовамі камунікацыі, апісанымі ў вучэбнай сітуацыі [6, 7, 11, 14, 17, 22, 23, 24, 25, 30, 34, 38].

2. У адпаведнасці з вызначанымі падыходамі і прынцыпамі фарміруюцца базавыя веды і ўменні камунікатыўнай кампетэнцыі.

Моўны кампанент фарміруецца на аснове базавых *моўных ведаў і ўменняў,* што ўяўляюць сабой звесткі пра функцыянальныя адзінкі беларускай мовы і правілы іх ужывання.

Маўленчы кампанент фарміруецца на аснове базавых *маўленчых ведаў і ўменняў* праз засваенне маўленчых паняццяў (сітуацыя маўлення, тэкст, стыль, жанр, тып маўлення, дыялог, маналог), фарміраванне ўменняў маўленчай дзейнасці (якаснае ўспрыманне, разуменне, структураванне і перапрацоўка інфармацыі, аналіз, стварэнне і рэдагаванне выказванняў) і ўсведамленне камунікатыўных якасцей маўлення (дакладнасць, выразнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце).

Уласна камунікатыўны кампанент фарміруецца на аснове базавых *уласна камунікатыўных ведаў і ўменняў* праз засваенне правіл маўленчых паводзін, спосабаў выражэння думак згодна з сітуацыяй маўлення, прадуцыраванне ўласнага выказвання ў адпаведнасці са стылем, тыпам і жанрам маўлення, запамінанне формул маўленчага этыкету і сацыяльна маркіраваных маўленчых адзінак [4, 7, 10, 12, 24, 28, 31, 33, 38].

3. Праведзены аналіз сродкаў навучання беларускай мове для V – VI класаў паказаў, што пералік уласна камунікатыўных уменняў не ўключаны ў вучэбныя праграмы, у сувязі з чым падручнікі не ўтрымліваюць у поўнай меры ўласна камунікатыўны змест для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. У змесце навучання не ўлічваецца рэальны ўзровень маўленчага развіцця вучняў, паслаблена ўвага да засваення камунікатыўна значымага моўнага і маўленчага матэрыялу.

Для вызначэння рэальнага ўзроўню сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў распрацаваны наступныя

крытэрыі, суадносныя з яе кампанентамі. *Крытэрый якасці адбору моўных сродкаў* дэманструе ўзровень базавых моўных (лексічных, граматычных, арфаэпічных і акцэнтуацыйных) ведаў і ўменняў вучняў, ступень усведамлення камунікатыўнай значымасці моўных адзінак для маўлення. Узровень сфарміраванасці базавых маўленчых ведаў і ўменняў вызначаецца з дапамогай *крытэрыю маўленчай кампетэнцыі выказвання,* які паказвае ўзровень засваення маўленчых паняццяў; *колькасна-інфармацыйнага крытэрыю,* які дазваляе вызначыць адпаведнасць зместу выказвання яго тэме і правільнасць ужытага фактычнага матэрыялу; *якасна-інфармацыйнага крытэрыю*, які вызначае паслядоўнасць і лагічнасць зместу, уменні кампазіцыйнага афармлення выказвання, *крытэрый камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення,* які дэманструе ступень усведамлення вучнямі камунікатыўных якасцей маўлення. Базавыя ўласна камунікатыўныя веды і ўменні згодна з узроўнем іх развіцця вызначаюць *сацыякультурны крытэрый,* які вызначае набытыя ўменні будаваць выказванне ў адпаведнасці з экстралінгвістычнымі фактарамі маўлення; *этыка-прагматычны крытэрый*, які дэманструе валоданне сродкамі маўленчага этыкету, разнастайнымі прыёмамі і спосабамі выражэння думак.

Канстатуючы эксперымент паказаў нізкі ўзровень сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. Бедны слоўнікавы запас, змешванне лексічных адзінак беларускай і рускай моў, нетрывалыя граматычныя ўменні, няўменне дыферэнцыраваць сродкі мовы ў адпаведнасці са стылем маўлення не дазваляюць у поўнай меры правільна і дакладна рэалізаваць задуму выказвання, што сведчыць пра нізкі ўзровень сфарміраванасці *базавых моўных ведаў і ўменняў.* Нетрываласць засваення маўленчых паняццяў прадэманстравала недастатковы ўзровень *базавых маўленчых ведаў і ўменняў.* Няўменне выбіраць неабходныя спосабы рэалізацыі камунікатыўнага намеру, няведанне вучнямі нормаў маўленчых паводзін і спецыфічных беларускамоўных этыкетных адзінак (якім пераважная большасць вучняў не надавала ўвагі пры афармленні выказвання) сведчаць пра нізкі ўзровень сфарміраванасці *базавых уласна камунікатыўных ведаў і ўменняў* [5, 11, 15, 20, 21, 25, 38].

4. Методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў, заснаваная на вызначаных падыходах, прынцыпах, змесце і сістэме практыкаванняў, накіравана на: 1) засваенне функцыянальных адзінак розных узроўняў беларускай мовы і правіл іх ужывання ў выказванні (моўны матэрыял, неабходны для камунікатыўна-мэтазгоднага забеспячэння зместу маўлення); 2) авалоданне маўленчымі паняццямі, уменнямі маўленчай дзейнасці, правіламі стварэння выказвання,

усведамленне камунікатыўных якасцей маўлення (практычная маўленчая дзейнасць, неабходная для асэнсавання камунікатыўных якасцей маўлення); 3) свядомае авалоданне спосабамі выражэння камунікатыўнага намеру, правіламі маўленчых паводзін і этыкі маўлення, сацыяльна маркіраванымі маўленчымі адзінкамі і формуламі маўленчага этыкету (уласна камунікатыўны матэрыял, неабходны для афармлення выказвання і выражэння правіл маўленчых паводзін у адпаведнасці з сітуацыяй і сферай маўлення).

Працэс фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі забяспечваецца сістэмай камунікатыўна-моўных, камунікатыўна-маўленчых і ўласна камунікатыўных практыкаванняў.

Сістэма *камунікатыўна-моўных практыкаванняў* накіравана на выяўленне і разгляд функцыі моўных адзінак у тэксце, у працэсе чаго вучні прыходзяць да асэнсавання сутнасці моўных з’яў з пазіцыі іх камунікатыўнай значымасці. Далейшае ўключэнне іх ва ўласнае выказванне дапамагае ўсвядоміць вучням моўныя адзінкі як сродкі выражэння думак і пачуццяў у розных сітуацыях маўлення. У выніку фарміруюцца ўменні камунікатыўна-мэтазгоднага выкарыстання адзінак мовы ў адпаведнасці з нормамі маўлення.

Сістэма *камунікатыўна-маўленчых практыкаванняў* накіравана на: 1) свядомае ці імпліцытнае засваенне сутнасці маўленчых паняццяў; 2) фарміраванне ўменняў маўленчай дзейнасці; 3) асэнсаванне і аналіз тэксту як адзінкі маўлення і ўсведамленне камунікатыўных якасцей маўлення. Пры засваенні маўленчых паняццяў у сістэму працы ўключаюцца заданні, распрацаваныя з улікам складнікаў сітуацыі, што прыводзіць да разумення залежнасці выніку маўленча-мысліцельнай дзейнасці суразмоўцаў ад іх камунікатыўнага намеру і сацыяльна-ролевай характарыстыкі. Пры стварэнні вучнямі выказванняў увага засяроджваецца на сінтаксічным і структурным адзінстве тэксту, яго функцыянальна-сэнсавых і жанравых асаблівасцях, што дапамагае зразумець правілы кампазіцыйнай арганізацыі тэксту, прыёмы выражэння вядомай і новай інфармацыі. Чым больш асэнсавана падыходзяць вучні да вывучэння маўленчых паняццяў, тым больш трывала замацоўваюцца не толькі маўленчыя веды, але і разнастайныя моўныя адзінкі, якія забяспечваюць уменне весці суразмоўніцтва па-беларуску.

Сістэма *ўласна камунікатыўных практыкаванняў* накіравана на засваенне: 1) спосабаў выражэння думкі ў адпаведнасці з камунікатыўнай мэтай, задачамі і ўмовамі зносін; 2) правіл маўленчых паводзін; 3) формул маўленчага этыкету і сацыяльна маркіраваных маўленчых адзінак. Яны распрацоўваюцца на аснове *камунікатыўнага аналізу тэксту* і *сацыяльна-ролевай гульні.* Праз *камунікатыўны каментарый* вучні даведваюцца пра

спосабы афармлення ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай такіх выказванняў, як *прывітанне, развітанне, знаёмства, просьба, прабачэнне, парада (рэкамендацыя), прапанова, адмова, віншаванне, усхвальяльнае слова, тэлефонная размова, падтрымка кантакту ў вусным маўленні*. Пры гэтым засвойваюцца як правілы ўжывання моўных сродкаў згодна з нормамі этыкі, так і формулы маўленчага этыкету ў пэўных маўленчых актах [1 – 3, 6 – 9, 13, 16, 18, 19, 27, 28, 31, 32, 34, 35 – 40].

Фарміраванне базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі носіць сістэмны характар на працягу вывучэння курса беларускай мовы ў V – VI класах. Прапанаваная методыка навучання садзейнічае авалоданню мовай як сродкам зносін і аптымізуе працэс навучання беларускай мове.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Праведзенае даследаванне ў тэарэтычным і практычным аспектах выяўляе эфектыўнасць распрацаванай методыкі фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі пры вывучэнні беларускай мовы ў V – VI класах. Апрабацыя методыкі фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў эксперыментальна праверана і знайшла адлюстраванне ў вучэбна-метадычным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, які ўключаны ў пералік сродкаў вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з Інструктыўна-метадычным пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь [38].

Распрацаваныя крытэрыі і заданні канстатуючага і навучальнага эксперыментаў могуць быць выкарыстаны як у якасці кантрольна-вымяральнага матэрыялу для дыягностыкі асобна моўнага, маўленчага і ўласна камунікатыўнага развіцця вучняў, так і ў адукацыйным працэсе з мэтай фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў [5, 15, 20].

Вывады і вынікі працы выкарыстоўваюцца ў сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, а таксама ў курсе методыкі выкладання беларускай мовы ў ВНУ [1 – 9, 26, 35, 38 – 41].

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навукова-метадычных часопісах

1. Мартынкевіч, С.В. Актывізацыя маўлення на ўроку беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 5. – С. 41 – 55.

2. Мартынкевіч, С.В. Дыктант у сістэме камунікатыўных практыкаванняў / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 7. – С. 18 – 22.

3. Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай культуры школьнікаў на ўроках беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 10. – С. 31 – 38.

4. Мартынкевіч, С.В. Лінгвадыдактычная мадэль камунікатыўнага ядра моўнай асобы школьніка / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2008. – № 2. – С. 33 – 36.

5. Мартынкевіч, С.В. Узровень развіцця камунікатыўных уменняў вучняў V – VI класаў школ з рускай мовай навучання / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 3. – С. 56 – 60.

6. Мартынкевіч, С.В. Базавыя кампаненты методыкі развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2009. – № 9. – С. 61 – 65.

7. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўная кампетэнцыя: Сутнасць паняцця і прынцыпы адбору зместу яе фарміравання / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2011. – № 3. – С. 82 – 85.

8. Мартынкевіч, С.В. Тыпалогія практыкаванняў па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў агульнаадукацыйных устаноў / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2011. – № 4. – С. 78 – 81; – № 5. – С. 71 – 73

9. Мартынкевіч, С.В. Вывучэнне маўленчых паняццяў на камунікатыўна-дзейнаснай аснове: ад тэорыі да практыкі (V – VI клас) / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2013. – № 9. – С. 71 – 74; – № 10. – С. 60 – 63.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

10. Мартынкевіч С.В. Лінгвістычная тэрміналогія ў школьным курсе беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч // Актуальныя праблемы развіцця сучаснай методыкі выкладання беларускай мовы: зб. арт. / Нац. ін-т адукацыі ; пад. рэд. В.П. Протчанкі, М.Г. Яленскага. – Мінск, 2003. – С. 90 – 93.

11. Мартынкевіч, С.В. Умовы фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні блізкароднасных моў / С.В. Мартынкевіч // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія : матэрыялы VII Міжнар. навук. канф.: зб. навук. арт. / Віц. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. Г.М. Мезенка. – Віцебск, 2006. – С. 209 – 212.

12. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўнае ядро моўнай асобы вучня: структура і змест / С.В. Мартынкевіч // Текст. Язык. Человек : сб. науч. тр. : в 2 ч. / Мозырский гос. пед. ун-т им. И.П. Шамякина ; отв. ред. С.Б. Кураш, В.Ф. Русецкий. – Мозырь, 2007. – Ч 2. – С. 179 – 180.

13. Мартынкевіч, С.В. Механізмы маўленчай камунікацыі як фактар развіцця камунікатыўных уменняў школьнікаў / С.В. Мартынкевіч // Текст. Язык. Человек : сб. науч. тр. : в 2 ч. / Мозырский гос. пед. ун-т им. И.П. Шамякина ; редкол.: С.Б. Кураш (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь, 2009. – Ч.2. – С. 129 – 131.

14. Мартынкевіч, С.В. Заканамернасці і прынцыпы фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове / С.В. Мартынкевіч // Образование и педагогическая наука : тр. Нац. ин-та образования. Сер. 1, Гуманитарное образование / Нац. ин-т образования. – Минск, 2009. – Вып. 3 : Подходы и принципы. – С.167 – 173.

15. Мартынкевіч, С.В. Крытэрыі ацэнкі ўзроўню камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С.В. Мартынкевіч // Коммуникативная компетенция : принципы, методы, приёмы формирования : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2011. – Вып. 10. – С. 20 – 26.

16. Мартынкевіч, С.В. Дыдактычныя магчымасці гульні як элементу інавацыйнай камунікатыўнай тэхналогіі пры навучанні беларускай мове / С.В. Мартынкевіч // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія : зборнік навуковых артыкулаў. : склад. Г.М. Мезенка, С.У. Нікалаенка ; пад навук. рэд. Г.М. Мезенка. – Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013.– С. 300 – 303.

**Матэрыялы канферэнцый**

17. Мартынкевіч, С.В. Паняцце камунікатыўнай кампетэнцыі ў кантэксце камунікатыўна-дзейнаснага падыходу да навучання беларускай мове ў сярэдняй школе / С.В. Мартынкевіч // Пісьменнік – мова – стыль : матэрыялы ІІІ Міжнар. навук. канф., Мінск, 29-30 верасня 2005 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; адк. рэд. М.Р. Прыгодзіч, М.І. Свістунова. – Мінск, 2006. – С. 262 – 264.

18. Мартынкевіч, С.В. Фарміраванне камунікатыўнай культуры як важнага кампанента сацыяльнага развіцця асобы школьніка / С.В. Мартынкевіч // Мова – Літаратура – Культура : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя праф. Л.М. Шакуна), Мінск, 16 – 17 лістапада 2006 г. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2007. – С. 605 – 608.

19. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўная культура школьніка: віды, прыёмы і сродкі фарміравання / С.В. Мартынкевіч // XII (59) науч. сессия препод., науч. сотр. и аспирантов ун-та : сб. ст. / Вит. гос. ун-т; редколл.: Г.И. Михасёв (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2007. – С. 190 – 191.

20. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўна-маўленчы патэнцыял асобы школьніка: дыягностыка і аналіз / С.В. Мартынкевіч // Креативные подходы в организации образовательного процесса : сб. материалов науч.-практ. конф. : в 2 ч., Гомель, 20 декабря 2007 года / Гомельский гос. обл. ин-т повыш. квалиф. и переподг. руковод. работников и специалистов образования ; редкол.: А.З. Бежанишвили [и др.]. – Гомель, 2007. – Ч. 2. – С. 117 – 122.

21. Мартынкевіч, С.В. Лінгвадыдактычны аналіз зместу навучання беларускай мове ў аспекце камунікатыўна-дзейнаснага падыходу / С.В. Мартынкевіч // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : матэрыялы рэсп. навук. канф. (да 70-годдзя з дня нараджэння прафесара Г.М. Малажай), Брэст, 20 – 21 сакавіка 2008 г. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна; рэдкал.: М.І. Новік [і інш.]. – Брэст, 2008. – С. 306 – 308.

22. Мартынкевіч, С.В Камунікатыўны аспект рэалізацыі задач навучання беларускай мове ў сучаснай школе / С.В. Мартынкевіч // Куляшоўскія чытанні: мат-лы Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24 красавіка 2009 г. / Магілёўскі дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова ; рэдкал. В.І. Рагаўцоў [і інш.]. – Магілёў, 2009. – С. 214 – 216.

23. Мартынкевіч, С.В. Сучасныя лінгваметадычныя падыходы да фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі асобы / С.В. Мартынкевіч // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства : матэрыялы VII Міжнар. навук. канф., Віцебск, 22 – 24 кастр. 2009 г. : у 2 ч. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал. : Г.М. Мезенка (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2009. Ч. 1. – С. 184 – 187.

24. Мартынкевіч, С.В. Да праблемы развіцця камунікатыўных уменняў з пазіцый сучаснай лінгвадыдактыкі / С.В. Мартынкевіч // Актуальные проблемы современного гуманитарного познания : материалы Междунар. науч. конф., Витебск, 29 – 30 октября 2009 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол. : В.И. Каравкин (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2009. – С. 245 – 247.

25. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўная кампетэнцыя як інтэгральная характарыстыка моўнай асобы // Наука – образованию, производству, экономике : материалы ХУ (62) региональной науч.-практ. конф. препод., науч. сотр. и аспирантов, посвящ. 100-летию со дня основания УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, Витебск, 3 – 5 марта 2010 г. / Вит. гос. ун-т; редкол.: А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2010. – С. 171 – 172.

26. Мартынкевіч, С.В. Фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў у сістэме менеджмента якасці ВНУ / С.В. Мартынкевіч // Система менеджмента качества в современном университете : достижения, проблемы и перспективы :

материалы науч.-практ. конф., Витебск, 2 – 3 июня 2010г. / Вит. гос. ун-т, редкол.: Н.А. Ракова (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2010. – С.118 – 121.

27. Мартынкевіч, С.В. Маўленчая дзейнасць як аснова фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С.В. Мартынкевіч // Сучасная моўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: праблемы, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (да 80-годдзя праф. В.У. Протчанкі), Мінск, 9 крас. 2010 г. – Мінск : РІВШ, 2010. – С.56 – 60.

28. Мартынкевіч, С.В. Маўленчая тэорыя ў сістэме фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 21 – 22 кастрычніка 2010 г. / Віц. дзярж. ун-т ; рэдкал. : Г.А. Арцямёнак, В.І. Русілка (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2010. – С. 241 – 244.

29. Мартынкевіч, С.В. Тэхналогія праектаў як інавацыйная форма арганізацыі і кантролю самастойнай работы студэнтаў ВНУ / С.В. Мартынкевіч // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XVI (63) региональной науч.-практ. конф. препод., науч. сотр. и аспирантов, посвящ. 100-летию со дня основания УО "ВГУ им. П.М. Машерова", Витебск, 16 – 17 марта 2011 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И.А. Щурок (гл. ред), А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2011. – Т.2. – С. 233 – 235.

30. Мартынкевіч, С.В. Аспекты фарміравання камунікатыўных уменняў вучняў ва ўмовах білінгвізму / С.В. Мартынкевіч // Актуальные проблемы приграничных районов Беларуси и Российской Федерации : материалы Международной научно-практической конференции, Витебск, 27 мая 2011г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: А.П. Солодков [и др.]. – Витебск, 2011. – С.185 – 187.

31. Мартынкевіч, С.В. Моўная кампетэнцыя як аснова фарміравання камунікатыўных уменняў асобы / С.В. Мартынкевіч // Формирование языковой компетенции в процессе профессиональной подготовки специалистов : традиции, новации, опыт внедрения современных технологий обучения : материалы Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 24 – 25 марта 2011 г. / под ред. С.Н. Короткой. – Минск: ВА РБ, 2011. – Т.2. – С. 191 – 194.

32. Мартынкевіч, С.В. Развіццё ўменняў пісьмовай камунікацыі пры навучанні беларускай мове / С.В. Мартынкевіч // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XVII (64) региональной науч.-практ. конф. препод., науч. сотр. и аспирантов УО "ВГУ им. П.М. Машерова", Витебск, 16 – 17 марта 2012 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И.А. Щурок (гл. ред.), А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2012. – Т.2. – С. 233 – 235.

33. Мартынкевіч, С.В. Лінгвамаўленчыя ўменні як аснова фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С.В. Мартынкевіч // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 2. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, каф. беларус. мовазнаўства ; рэдкал.: М.І. Новік [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2012. – С. 7 – 10.

34. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўна-дзейнаснае навучанне беларускай мове як інавацыйная тэхналогія / С.В. Мартынкевіч // Педагогические инновации : традиции, опыт, перспективы : материалы III Международной научно-практической конференции, Витебск, 3 мая 2012 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: Н.А. Ракова (отв. ред.) – Витебск : УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2012. – С. 98 – 100.

35. Мартынкевіч, С.В. Інфармацыйныя тэхналогіі ў працэсе навучання студэнтаў-філолагаў / С.В. Мартынкевіч // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXIII (65) региональной науч.-практ. конф. препод., науч. сотр. и аспирантов, Витебск, 13 – 14 марта 2013 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – Т.2. – С. 170 – 172.

36. Мартынкевіч, С.В. Навучанне беларускай мове на этнакультурнай аснове: ад тэорыі да практыкі / С.В. Мартынкевіч // Нацыянальна-культурны кампанент у дыялектнай і літаратурнай мове : матэр. рэспуб. нав.-практ. канф. (Брэст, 18 – 19 кастрычніка 2012 г.) / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Брэсцкі дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна; рэд. кал. : М.І. Новік [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2013. – С. 140 – 141.

37. Мартынкевіч, С.В. Асаблівасці працэсу фарміравання маўленча-камунікатыўных уменняў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя: сацыяльны, псіхалагічны і лінгваметадычны аспекты / С.В. Мартынкевіч // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : зборнік матэрыялаў навуковай канферэнцыі (да 75-годдзя з дня нараджэння праф. Г.М. Малажай) / Брэсцкі дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна; кафедра беларускага мовазнаўства ; рэдкал. : М.І. Новік [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2013. – С. 141 – 142.

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**

38. Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5 – 6 класы) : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С.В. Мартынкевіч. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 102 с.

**Метадычныя дапаможнікі**

39. Урок беларускай мовы : метадычныя рэкамендацыі / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2005. – 36 с.

40. Мартынкевіч, С.В Методыка выкладання беларускай мовы : вучэбна-метадычны комплекс / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2007. – 45 с.

41. Мартынкевіч, С.В. Вучэбная і вытворчая педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў : метадычныя рэкамендацыі / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 47 с.

# РЭЗЮМЭ


Мартынкевіч Святлана Васільеўна

**Методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў у працэсе навучання беларускай мове (V – VI класы)**

**Ключавыя словы:** камунікатыўная кампетэнцыя, базавыя моўныя веды і ўменні, базавыя маўленчыя веды і ўменні, базавыя ўласна камунікатыўныя веды і ўменні, методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Мэта** даследавання – вызначыць тэарэтычныя асновы і распрацаваць методыку фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў V – VI класаў, праверыць яе эфектыўнасць у працэсе вывучэння асноўных раздзелаў сістэмнага курса беларускай мовы.

**Метады даследавання:** аналіз навуковай літаратуры і нарматыўных дакументаў, назіранне за вучэбным працэсам, вывучэнне і абагульненне педагагічнага вопыту, вынікаў вучэбнай дзейнасці; педагагічны эксперымент, статыстычная апрацоўка дадзеных.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Вызначаны асноўныя напрамкі, падыходы і прынцыпы фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі; распрацавана сістэма базавых ведаў і ўменняў для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі; вызначаны камунікатыўны патэнцыял сродкаў навучання беларускай мове ў V – VI класах; распрацаваны крытэрыі ацэнкі і вызначаны зыходны ўзровень сфарміраванасці базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў V – VI класаў; распрацавана методыка фарміравання базавых ведаў і ўменняў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў, якая ўяўляе сабой сістэму камунікатыўна-моўных, камунікатыўна-маўленчых і ўласна камунікатыўных практыкаванняў, і праверана яе эфектыўнасць пры навучанні беларускай мове ў V – VI класах.

**Ступень выкарыстання.** Методыка фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў прайшла апрабацыю і знайшла адлюстраванне ў вучэбна-метадычным дапаможніку “Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5 – 6 класы)”.

**Галіна прымянення.** Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання беларускай мове ў V – VI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў і ў выкладанні студэнтам ВНУ курса “Методыка выкладання беларускай мовы”.

# РЕЗЮМЕ

Мартынкевич Светлана Васильевна

**Методика формирования базовых знаний и умений коммуникативной компетенции учащихся в процессе обучения белорусскому языку (V – VI классы)**

**Ключевые слова**: коммуникативная компетенция, базовые языковые знания и умения, базовые речевые знания и умения, базовые собственно коммуникативные знания и умения, методика формирования базовых знаний и умений коммуникативной компетенции.

**Цель** исследования – определить теоретические основы и разработать методику формирования базовых знаний и умений коммуникативной компетенции учащихся V – VI классов, проверить ее эффективность в процессе изучения основных разделов системного курса белорусского языка.

**Методы исследования**: анализ научной литературы и нормативных документов, наблюдение за учебным процессом, изучение и обобщение педагогического опыта, результатов учебной деятельности; педагогический эксперимент, статистическая обработка данных.

**Полученные результаты и их новизна**. Определены основные направления, подходы и принципы формирования базовых знаний и умений коммуникативной компетенции; разработана система базовых знаний и умений для формирования коммуникативной компетенции; определён коммуникативный потенциал средств обучения белорусскому языку в V – VI классах; разработаны критерии оценки и определен исходный уровень сформированности базовых знаний и умений коммуникативной компетенции у учащихся V – VI классов; разработана методика формирования базовых знаний и умений коммуникативной компетенции учащихся, представленная системой коммуникативно-языковых, коммуникативно-речевых и собственно коммуникативных упражнений, и проверена ее эффективность при обучении белорусскому языку в V – VI классах.

**Степень использования**. Методика формирования коммуникативной компетенции учащихся прошла апробацию и нашла отражение в учебно-методическом пособии “Развитие коммуникативной компетенции школьников при изучении белорусского языка (5 – 6 классы)”.

**Область применения**. Результаты исследования используются в процессе обучения белорусскому языку в V – VI классах учреждений общего среднего образования, в системе повышения квалификации учителей и в преподавании студентам вузов курса «Методика преподавания белорусского языка".

## SUMMARY

Svetlana Martynkevich

**Methods of formation of basic knowledge and skills of communicative competence of students in the process of teaching the Belarusian language (V – VI forms)**

**Key words**: communicative competence, basic language skills, basic speech skills, basic communicative skills proper, methods of formation of basic knowledge and skills of communicative competence.

**The purpose of the research** is to provide a theoretical basis and work out methods of forming basic knowledge and skills of communicative competence of students in V – VI forms, test its effectiveness in the process of studying the main sections of the Belarusian language course.

**Research methods:** analysis of scientific literature and normative documents in the field of linguistic methodology, educational monitoring, study and generalization of teaching experience and educational results; pedagogical experiment, statistical data processing.

**The results obtained and their novelty.** The main directions, approaches and principles of formation of basic knowledge and skills of communicative competence are defined; a system of basic knowledge and skills for the formation of communicative competence is developed and includes an innovative component of basic speech and language skills. For the first time the communicative skills proper are worked out; the communicative potential of the means of teaching the Belarusian language in V – VI forms is defined; the criteria for evaluating basic knowledge and skills of communicative competence are developed and the initial level of basic knowledge and skills of communicative competence of the students in V – VI forms is defined; a method of basic knowledge and skills of communicative competence formation is developed and is represented by a system of communicative language exercises, communicative speech exercises and communicative exercises proper; its effectiveness in teaching the Belarusian language in V – VI forms is tested.

**Degree of use.** The technique of communicative competence formation has been tested and is reflected in the tutorial "Development of communicative competence of students in the study of the Belarusian language (5 – 6 forms)".

**Field of application.** The results of the research are used at the lessons of the Belarusian language in V – VI forms in secondary education establishments as well as in the system of advanced training of teachers and in the course of Methodology of the Belarusian language in higher educational establishments.

Падпісана ў друк .2014. Фармат 60х841/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. Ул.-выд. арк.. Тыраж экз. Заказ.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
ЛВ № 02330 / 0494385 ад 16.03.2009.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33